*В.С.ВАРАПАЕВА*

# АКТЫВІЗАЦЫЯ ДУХОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ СРОДКАМІ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Пад духоўнасцю разумеецца пачуццёвая, інтэлектуальная сутнасць чалавека, супрацьлеглая яго фізічнай, цялеснай сутнасці.

Гэта паняцце шчыльна звязана з паняццем “мараль”, якое абазначае сукупнасць прынцыпаў і нормаў паводзін людзей між сабой і ў адносінах да грамадства.

Адной з важнейшых задач літаратурнай адукацыі ў ВНУ (незалежна ад спецыяльнасці) і з’яўляецца духоўнае выхаванне маладога чалавека з гуманістычным светапоглядам, самастойным мысленнем, развітым пачуццём нацыянальнай і асабістай годнасці, чалавека чулага, адданага агульначалавечым ідэалам, які здатны ўспрымаць і ствараць прыгожае. Менавіта высокамастацкія творы дазваляюць перадаць студэнтам сукупнасць ведаў аб маральных прынцыпах і нормах грамадства, сапраўднай духоўнасці чалавека. Каб працэс перадачы ведаў быў эфектыўны, неабходна асэнсоўваць субкультуру студэнтаў і разуменне імі духоўнасці.

Субкультура – сістэма каштоўнасцей і правіл паводзін пэўнай сацыяльнай групы. Каштоўнасці субкультуры – гэта не адмаўленне нацыянальнай культуры, а пэўнае адхіленне ад яе. Аднак, калі група выпрацоўвае нормы, якія супярэчаць агульнай культуры, тады фарміруецца контркультура.

У сучасным грамадстве адбываюцца значныя змены ў сферы палітыкі, эканомікі, сацыяльным і духоўным жыцці грамадства, стан культуры моладзі абумоўлены пэўнымі фактарамі, у прыватнасці пераходам да рынкавых адносін, які суправаджаецца пераацэнкай каштоўнасцей; з’яўленнем канкурэнцыі, якая не можа не паўплываць на духоўны свет моладзі і пад уплывам якой масавая культура становіцца агрэсіўнай.

Субкультура моладзі – гэта культура маладога пакалення, якому ўласцівы адпаведны стыль жыцця, паводзін, нормаў, пэўныя каштоўнасці і стэрэатыпы. Яна адрозніваецца тым, што каштоўнасці нацыянальнай культуры (класічнай, народнай) нярэдка выцясняюцца масавай культурай, любімымі героямі становяцца героі серыялаў, баевікоў, дэтэктываў.

Сучасная моладзь фарміруецца і развіваецца ў іншых сацыяльных умовах, чым тая, якая расла і фарміравалася ў канцы 80 – пачатку 90-х гадоў XX ст. І самае галоўнае, пэўныя змены адбыліся ў каштоўнасных арыентацыях моладзі: матэрыяльныя каштоўнасці дамінуюць над духоўнымі.

Маладыя людзі мала ўвагі надаюць чытанню, а калі і чытаюць, то дэтэктывы, літаратуру жахаў, любоўныя раманы (не лепшага гатунку). Безумоўна, што такая літаратура не можа духоўна ўзбагачаць асобу. Звернемся да канкрэтных прыкладаў разумення духоўнасці студэнтамі, у прыватнасці студэнтамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый і факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУ культуры і мастацтваў.

“Духовность – это совокупность качеств человека (интеллект, талант, воля, характер). Чтобы быть человеком в истинном значении этого слова, человек должен обладать духовным богатством, должен быть нравственным» (Наташа Т., III курс).

“Духовность – это способность человека чувствовать…” (Алена П., III курс).

“Для мяне духоўнасць – гэта ўменне спачуваць, суперажываць іншым людзям. Гэта ўменне адклікацца на чужы боль і чужую радасць…” Але душа і духоўнасць гэта не нешта, што даецца нам ад Бога як нязменная якасць. Духоўнасць трэба выхоўваць” (Лена К., III курс).

“Духовность – способность человека не нарушать Божьи заповеди. А для того, чтобы понять, духовен ли человек, нужно узнать, есть ли у него душа. Когда он посмотрел фильм о бездомных детях и сердце его не осталось равнодушным, ему хочется помочь, значит, душа у него есть” (Насця К., V курс).

“Духовность – это желание и умения ощущать всю прелесть падающего снега и мокрого дождя, прикосновение мягкой травы, слышать шелест листьев, услышать в музыке чью-то историю и прочесть в нескольких словах всю жизнь…” (Ганна К., I курс).

Адказы можна было б працягваць. Яны сведчаць, што студэнты ў цэлым правільна разумеюць духоўнасць. Адзінадушныя яны і ў тым, што сапраўднае мастацтва слова здольна актыўна ўплываць на выхаванне духоўнасці.

“Литература, безусловно, влияет на развитие духовности. Она учит человека чувствовать, а значит, очищает от повседневности и автоматизма” (Наташа А., III курс).

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

“В наше время, когда каждый сам за себя, литература помогает вспомнить о чести и достоинстве, о дружбе и многом другом” (Алена С., V курс).

“Читая литературное произведение, мы начинаем задумываться, а правильно ли себя ведем с близкими или друзьями, как изменить себя” (Таня Е., III курс).

“Калі ты чытаеш кнігі і ўсёй душой зліваешся з героямі, калі плачаш ці смяешся разам з імі, аналізуеш учынкі і г.д. – усё гэта сведчыць аб твоёй духоўнасці… Я ніколі не забуду, якое ўражанне зрабіла на мяне кніга В.Катаева “Сын палка”. Я плакала, перажывала за беднага хлопчыка, спачувала яму. Гонар за простага салдата, які вызваліў Радзіму ад карычневай чумы, перапаўняў мяне. Хіба гэта не выхаванне духоўнасці? Калі чалавек можа паспачуваць літаратурнаму герою, ён абавязкова зможа паспачуваць ці парадавацца разам з тымі, хто яго акружае” (Насця П., V курс).

“Каждый автор в своих произведениях через образы, характеры и поступки героев стремится показать какие-то моральные ценности человека. Поэтому, чем больше читает человек, тем более развивается он духовно” (Ніна А., III курс).

“Однако не всегда автор прямо говорит о главном. Поэтому каждый человек делает свои выводы из прочитанного. Умение сделать правильные выводы, пропустить произведение через себя, почувствовать, осмыслить, что хотел сказать автор, – все это содействует формированию духовности…” (Вольга М., III курс).

“Прочитанное произведение оставляет след в душе, тем самым прокладывая путь к духовности…” (Каця М., III курс).

Агульнавядома і тое, што не кожны твор можа аказаць глыбокае ўздзеянне на духоўную сферу чытача, а толькі высокамастацкі.

Духоўнае ўзбагачэнне асобы пад уздзеяннем літаратуры здзяйсняецца перш за ўсё ў працэсе непасрэднага ўспрымання твораў, шляхам эмацыянальнага самаўключэння ў чужое жыццё, адлюстраванае ў творы, праз яго адкрыццё і разуменне. Такім чынам, актывізацыя духоўнай дзейнасці адбываецца пры суперажыванні. Вядома, што спасціжэнне твора – працэс індывідуальна творчы. Па-першае, таму, што чытанне – гэта даверлівы дыялог пісьменніка і чытача. Па-другое, творчае чытанне – актыўная сумесная творчасць чытача і пісьменніка. Чытач як бы паўтарае ўжо пройдзены аўтарам шлях, пазнаючы жыццё, паказанае ў творы. Гэтая духоўная дзейнасць працягваецца і пасля таго, як перагорнута апошняя старонка кнігі: узнікаюць думкі, пачуцці, меркаванні, вобразы працягваюць дзейнічаць, выклікаюць параўнанні, асацыяцыі, уплываюць на погляды, дзеянні.

Калі чытанне не захапляе асобу, калі не адбываецца таго, што В.Сухамлінскі называў духоўнасцю ў зносінах з творам, калі змест не прапускаецца праз сэрца і пачуцці чалавека і не адбіваецца на яго ўчынках, узаемаадносінах з людзьмі, то чалавек застаецца на ніжэйшай ступені чытацкага развіцця. Мера чытання мастацкай літаратуры – гэта мера інтэрыярызацыі і экстэрыярызацыі ў іх адзінстве.

Інтэрыярызацыя – пераўтварэнне зместу твора ва ўнутранае “дасягненне” асобы, своеасаблівая селекцыя чытаемага ў адпаведнасці з жыццёвымі і чытацкімі ўстаноўкамі чалавека, яго культурай, узростам. Засвойваючы багацце вобразаў, праводзячы іх адбор у сваёй чытацкай свядомасці, чалавек узнімаецца на новую ступень свайго духоўнага развіцця, з якой ён па-іншаму глядзіць на самога сябе і акаляючую рэчаіснасць. Для працэсу экстэрыярызацыі характэрна пераўтварэнне ўнутранага ў знешняе, рэалізацыя багацця душы ва ўзаемаадносінах з людзьмі, грамадствам. Дзякуючы гэтаму здзяйсняецца працэс паступовага развіцця асобы сродкамі. Таму ў працэсе выкладання літаратурных курсаў неабходна ў першую чаргу звяртаць увагу і школьнікаў, і студэнтаў на ўнутраны свет мастацкага твора, актывізаваць сілу пачуццяў навучэнцаў, іх творчае ўяўленне.

Нельга спяшацца з абагульненнямі. Складаная і непаўторная тканіна мастацкага твора супраціўляецца абагульненню. Доўгі шлях павінен прайсці чытач, перш чым ён зразумее змястоўныя глыбіні твора. І тут ніяк не падыхо- дзяць тэставыя заданні, якія накіраваны на фактычнае засваенне твора, на яго паверхневы слой. Яны не даюць магчымасці паразважаць, адчуць унутраную сілу твора, яго духоўнасць. Мастацтва нельга загнаць у тэст. А вось творчыя заданні, якія можна практыкаваць і на семінарскіх занятках, і ў самастойнай працы, якраз дапамагаюць актывізаваць духоўную дзейнасць студэнтаў, пранікнуць у падтэкст твора, зазірнуць у таямніцы лабараторыі пісьменніка. Пакажам гэта на прыкладзе шэдэўра прыгожага пісьменства – казкі французскага пісьменніка А. Сент-Экзюперы “Маленькі прынц”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнтам прапанавалася паразважаць над пытаннямі :

1. Малюнак слана ва ўдаве падобны на капялюш. Што гэта азначае?

2. Як растлумачыць супярэчлівасць выказванняў Ружы, адрасаваных прынцу: “Настанет вечер – накройте меня колпаком. У вас тут слишком холодно”. “Оставь колпак: он мне больше не нужен”. Звяжыце са словамі прынца: “Ничего я тогда не понимал”.

3. Што аб’ядноўвае маленькага хлопчыка і лётчыка? На чым было заснавана іх сяброўства?

4. Чаму лісу хацелася, каб яго прыручылі?

5. Што далі Маленькаму прынцу сустрэчы з рознымі людзьмі? Якія высновы ён зрабіў?

6. Што вымушала Маленькага прынца імкнуцца на родную планету, калі яму так хораша было з сябрамі на Зямлі?

7. Якімі эпітэтамі можна выказаць агульны настрой казкі? Якім адным словам ахарактарызаваць яе?

8. Якія асацыяцыі, пачуцці абудзіла казка?

9. Аўтар зазначае: “Я не хачу, каб маю казку чыталі дзеля забавы.” А для чаго?

Прапануючы студэнтам пытанні, рыхтуючы іх да выканання пэўных сацыяльных роляў, мы памяталі, што ў працэсе сацыялізацыі чалавек не проста адаптуецца ў асяроддзі і засвойвае прапанаваныя грамадствам сацыяльныя нормы, але і выпрацоўвае асабісты погляд на іх. Гэты погляд не павінен супярэчыць агульначалавечым нормам і каштоўнасцям. І ў гэтым сэнсе вялікае значэнне мае філасофская казка А.Сент-Экзюперы “Маленькі прынц”. Студэнтам неабходна было актывізаваць свае веды, свой вопыт і на іх падставе выказаць свае погляды, меркаванні.

Першае пытанне прадугледжвала пранікненне ўвогуле ў сэнс мастацтва. Яно, як правіла, шматслойнае. І кожны індывідуум бачыць у ім тое, што можа ўбачыць, адчуць. Пэўны жыццёвы, эмацыянальны, прафесійны вопыт уплывае на такое бачанне. Аналіз адказаў на пытанні пацвердзіў гэта: студэнты ў малюнку А.Сент-Экзюперы ўбачылі, у першую чаргу, “олицетворение детской, непостижимой фантазии. Дети иначе, чем взрослые, понимают мир, как-то по-волшебному, а значит, и отражают его по-своему… Все взрослые когда-то были детьми, только большинство из них об этом забыли. Да здравствуют слоны и удавы!!!” (Наташа Е., ІІІ курс);

“…Утрата взрослыми людьми непосредственного детского воображения – это своеобразная утрата частички души” (Алена Л., V курс).

Сент-Экзюперы пісаў сваю незвычайную, прасякнутую гуманізмам казку на вайне, думаючы пра тое, што будзе потым. Ён і хацеў, каб дзеці выкарчоўвалі “баабабы” на сваёй планеце, якія могуць разарваць яе на часткі. Экзюперы сам ілюстраваў казку, і калі мы глядзім на карані баабабаў, якія ахінулі ўсю маленькую планету і хочуць знішчыць яе, то ўспамінаем знак свастыкі. А.Сент-Экзюперы пісаў: “А калі я маляваў баабабы, мяне натхняла ўразуменне, што гэта вельмі важна і неадкладна”.

І сама казка напісана таму, што гэта было “вельмі важна і неадкладна”. Як часта паўтараў аўтар, семя ляжыць у зямлі да пары да часу, а потым прарастае, і з семя кедра вырасце кедр, а з семя цярноўніка – цярноўнік. Патрэбна, каб вырастала добрае семя. “Усе ж дарослыя спачатку былі дзецьмі”.

Казку гэтую трэба чытаць удумліва, павольна, бо яна адлюстроўвае філасофскі погляд на пачуццё чалавека, яго прызначэнне. Гэта, на думку І.С.Чарняўскай, свайго роду евангелле – вучэнне аб тым, як трэба жыць лю- дзям, каб быць шчаслівымі, не згубіць сваіх чалавечых якасцей. Аўтар пераконвае чытача, што самае галоўнае знаходзіцца ўнутры нас, у нашых адносінах да маральных і матэрыяльных каштоўнасцей. Не выпадкова з самага пачатку ён супрацьпастаўляе свет дзіцяці свету дарослага.

У час творчай працы большасць студэнтаў, каля 90 % (працай было ахоплена больш за 100 чалавек названых вышэй факультэтаў), сканцэнтравалі ўвагу на параўнанні свету дарослых і дзяцей. І толькі нязначная колькасць (10–15%) адзначылі: “То, что главное, всегда скрыто, и с первого взгляда его не разглядишь” (Ганна А., V курс).

“Внешне многие вещи похожи, но по содержанию и смыслу они отличаются. Не каждый способен понять, что именно выражал творец, создавая свою работу, но у каждого есть свой взгляд на это. Рисунок слона в удаве – это тест для детей и особенно для взрослых, которые воображают, будто они все знают в этом мире, будто у них богатый опыт, с которым не всякий поспорит, а особенно ребенок…” (Дзмітрый Б., V курс).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уменне абстрагавацца, адысці ад канкрэтнага не заўсёды ўласціва юнакам. Тым не менш іх развагі аб дзецях, носьбітах шчырасці, непасрэднасці, хваляванні пра дарослых, якія страчваюць многае, заслугоўваюць увагі.

Другое пытанне патрабавала ад студэнтаў пранікнення ва ўнутраны свет Маленькага прынца і Ружы, разумення іх адносін, матывацыі ўчынкаў. І варта заўважыць, што ўсе студэнты імкнуліся асэнсаваць іх, выказаць свае меркаванні. Пры гэтым развагі часта выходзілі за межы твора, супастаўленні з жыццём давалі студэнтам магчымасць глыбей адчуць падтэкст казкі А.Сент-Экзюперы.

Прыводзім найбольш цікавыя і тыповыя выказванні.

"Роза была настоящей барышней: слегка кокетливой, в меру эгоистичной, чувствующей свою уникальность. Фактически она не нуждалась ни в колпаке, ни в ширме, единственное, чего она действительно хотела, – любить и быть любимой. Будучи внимательным и предупредительным во всем по отношению к цветку, Маленький принц не осознал истинного желания Розы, и это был тот единственный раз, когда этот чудесный малыш проявил недальнозоркость сердца…" (Алена Т., V курс).

"Розе нужна была забота Маленького принца. За ее капризами скрывалась любовь, что в конце концов вдали от нее он и понял" (Ларыса А., III курс).

"Отношения Розы и Маленького принца, их поступки и слова – все это выражение любви и привязанности друг к другу. Хотя поняли они это не сразу" (Алеся Т., III курс).

"Роза просила накрыть ее колпаком потому, что боялась реальной жизни, боялась настоящих чувств… Если сравнивать Розу с девушкой, то все ее поведение – защитная реакция. Она пытается контролировать буквально все свои чувства, как положительные, так и отрицательные. С чувством любви у нее ассоциируется гордость, которой у нее предостаточно. Но пришло время, и она поняла, что нужно жить по-настоящему, не прячась от жизни, пройти через радости и горе…" (Яўгенія В., V курс).

"Роза боится сквозняков… Что ж, люди тоже боятся … мелочей. Самое страшное, что порой губит человеческие отношения и даже судьбы, это мелочи, которые люди не хотят друг другу прощать. Иногда они не умеют увидеть самого главного, чего глазами-то и не увидишь.

И когда Роза наконец-то поняла, что Маленький принц решил покинуть эту планету и ее, ей не захотелось жить" (Юля С., V курс).

«Роза любила принца, а он ее не понял. И впоследствии осознал это: "Ничего я тогда не понимал! Надо было судить не по словам, а по делам. Она дарила мне свой аромат, озаряла мою жизнь. Я не должен был бежать!.. Но я был слишком молод, я не умел любить"» (Таня Е., III курс).

Трэцяе і чацвёртае пытанні вельмі блізкія па сваёй сутнасці, бо патрабуюць разумення таго, што ўвогуле аб'ядноўвае людзей, на чым будуюцца іх сяброўствa, прыязныя адносіны, чым каштоўныя гэтыя адносіны.

"Гэта вельмі маркотна, калі забываюць сяброў. Не ў кожнага ёсць сябар, – гаворыць аўтар казкі. – Чалавек, які не шукае сяброў, не любіць іх, чарсцвее і засыхае".

Аналіз студэнцкіх адказаў сведчыць пра тое, што для моладзі пытанні сяброўства, узаемаадносін даволі актуальныя і хвалюючыя. Пацвердзім гэта прыкладамі.

"Маленький принц и Летчик срослись душами, пустыня породнила их. Пустыня… Это загадочная, сложная, полная испытаний жизнь.

Дружба и единство душ объединило принца и Летчика. И это самое важное, когда одна душа находит отклик в другой" (Наташа Е., III курс).

"Маленького принца и Летчика объединяет чувство ностальгии по родине. Автор тоскует по оккупированной фашистами родине, а принц – о своей планете и любимой Розе…" (Алена Т., III курс).

"Их объединяло то, что они были живыми, не застывшими типажами королей, честолюбцев, а ищущими, путешествующими мечтателями, каждый день которых даже в безжизненной пустыне был не похож на другой" (Алена Т., V курс).

"Дружба Маленького принца и Летчика основана на одиночестве… Принц был одинок в своем мире, а Летчик оказался одиноким в пустыне" (Дзмітрый Д., V курс).

"Лис… Это еще одно одиночество. Быть на земле среди миллионов людей одиноким – это поистине самое страшное для человека и… Лиса. Нужно непременно, чтобы все маленькие принцы и все лисы обязательно встретились. Иначе для чего нам тогда общая планета?" (Наташа Е., III курс).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Менавіта на Зямлі Маленькі прынц разумее, што такое сапраўднае сяброўства. Ліс якраз і тлумачыць яму, што самае галоўнае – гэта быць патрэбным адзін аднаму і быць у адказе не толькі за сябе, але і за свайго сябра: “Для того, чтобы стать для кого-то единственным, а не одним из многих. Чтобы разбудить в своем сердце такое важное и такое теплое чувство, позволяющее ощущать, что ты живешь. Для того, чтобы ранее безразличные золотые колосья ржи вдруг стали напоминанием о цвете волос любимого существа» (Алена Т., V курс).

“Узнать можно только те вещи, которые приручишь, – сказал Лис. – У людей уже не хватает времени что-либо узнавать. Они покупают вещи готовыми в магазинах. Но ведь нет таких магазинов, где торговали бы друзьями”.

Вопыт Ліса і Змяі адкрываюць Маленькаму прынцу вялікую сутнасць са- праўднага сяброўства. Чалавек не павінен быць адзінокім, ён не можа жыць без сяброў, ён у адказе за ўсіх, “каго прыручыў”. Адказы студэнтаў – яркія сведчанні разумення гэтых важных пытанняў.

Казка “Маленькі прынц” шматслойная, але прасякнута адзінай лініяй – жыць трэба так, “чтобы не было мучительно больно за бесцельно прожитые годы…” Бессэнсоўнасць існавання і растрачанага жыцця, імкненне да багацця, барацьба за ўладу – якасці людзей, якія ўявілі, што яны валодаюць “здаровым сэнсам”. Вандраванні прынца на суседнія планеты, дзе жывуць каралі, якіх цешыць думка, што яны могуць уладарыць, славалюбы, дзелавыя людзі, якія нічога не бачаць, акрамя сваіх мільёнаў, псеўдавучоныя, выклікаюць у Маленькага прынца толькі здзіўленне і жаль.

У гэтай казцы, напоўненай водарам далёкай ружы, асвежанай халоднай вадой крыніц, апаленай сонцам пустыні, прасякнутай глыбокім лірызмам са- праўдных чалавечых пачуццяў, знаходзіцца месца і для сатыры. З якім сарказмам расказвае аўтар пра караля без падданых, якім ён хацеў бы аддаваць загады, аб халодным дзялку, аб закаханым у сябе славалюбе, аб непрабудным п’яніцы! Адзін толькі ліхтаршчык выклікае павагу ў Маленькага прынца. Але і яго праца бессэнсоўная, хаця ён чалавек слова і верны абавязку. Ці адчулі гэта студэнты, чытаючы твор? Звернемся да адказаў.

“Маленький принц встречался с разными людьми, и все они олицетворяют разные пороки: честолюбие, пьянство, желание иметь побольше денег. Только фонарщик думает не о себе. Побольше бы таких фонарщиков, которые бы не только умели зажигать фонари, но и разжигать человеческие сердца” (Таня С., V курс).

“Маленький принц увидел, как стереотипен мир большинства людей, глубоко заблуждающихся, считая, что они живут по-настоящему” (Вольга З., V курс).

Асноўная колькасць адказаў студэнтаў тычыцца менавіта апошняй думкі. І, безумоўна, адказы на наступнае пытанне пацвердзілі правільнасць разумення глыбокага філасофскага сэнсу казкі. Чаму прынц не застаўся на Зямлі?

“Он понял, что даже на самой маленькой планете можно быть счастливым и не чувствовать себя одиноким, когда тебя там кто-то любит” (Алена Т., V курс).

«Он скучал по Розе. Хотел объяснить, что он чувствовал, находясь вдали от нее, обогреть ее, заслонить от ветра. Он почувствовал ответственность, так как “приручил” ее» (Алена Т., III курс).

“Он понял смысл, ценность жизни” (Дзмітрый Б., V курс).

Сёмае, восьмае і дзевятае пытанні патрабавалі ад студэнтаў грунтоўнай ацэнкі твора на падставе яго эстэтыка-функцыянальнага аналізу. Даследаванне твора праз прызму сваіх асабістых пачуццяў, эмоцый выклікала і даволі цікавыя высновы. У асноўным усе студэнты зразумелі твор, адчулі яго прыгажосць, непаўторнасць. Казка выклікала пэўныя асацыяцыі, развагі, перажыванні, актывізавала духоўную дзейнасць студэнтаў. Пра гэта сведчаць адказы.

“Казка цудоўная. Філасофская. Мудрая. Сумная. Добрая. Загадкавая. Адказная”. Гэтымі і іншымі эпітэтамі характарызавалі студэнты казку.

“Если говорить пафосно, то сказка – совершенна, а если по-простому, то – самая лучшая! Возникли ощущение хрупкости, уникальности истинных чувств и бесконечное чувство светлой грусти” (Алена Т., V курс).

“Помогает искать себя в жизни” (Дзмітрый Б., V курс).

“Ощутила ценность дружбы и взаимопонимания. Готовность прийти на помощь, бескорыстие – это объединяет духовно” (Наташа П., V курс).

“Сейчас я временно живу вдали от родителей. Эта сказка вызвала у меня чувство ностальгии по моей маленькой родине. Мне захотелось приехать домой, обнять родных, сказать им, что я их очень люблю…” (Аня Т., III курс).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важна і тое, што чытачы зразумелі і агульначалавечую каштоўнасць казкі А.Сент-Экзюперы "Маленькі прынц", і задуму аўтара. Яны лічаць, што "живые, мыслящие, а еще важнее чувствующие люди всегда понятны друг другу, независимо от национальности. Экзюпери смог затронуть самые тонкие струны живой души" (Алена І., ІІІ курс).

Казку гэту варта чытаць, перачытваць «…для того, чтобы каждый смог задуматься и решить для себя, окончательно ли ты стал взрослым или только стареешь… А для этого нужно прочувствовать каждый эпизод сказки, побывать вслед за Маленьким принцем на разных планетах, если хотите, нужно умереть с ним от укуса змеи, вот что значит прочесть ее не для забавы. "Маленький принц" не для развлечения» (Юля С., V курс).

"Эта сказка для тех, кто учится чувствовать и думать, кто хочет принимать самостоятельные решения, кто ищет истину и у кого есть сердце" (Таня Е., III курс).

"Из сказки я вынесла то, что надо быть точным, ценить друга, не терзать его сердце напрасными тревогами, мало быть красивым, надо быть не пустым, приносить людям пользу, добро…" (Алена Л., V курс).

"Автор хочет, чтобы люди изменялись к лучшему… Сказка помогает самопознанию" (Аліса Л., ІІІ курс).

Развітваючыся з аўтарам казкі, Маленькі прынц пакідае яму бясцэнны падарунак – зоркі.

"У кожнага чалавека свае зоркі, – гаворыць ён. – Адным – тым, што ван- друюць, яны ўказваюць шлях. Для другіх гэта проста маленькія агеньчыкі. Для вучоных яны – як задача, якую трэба рашаць… Але для ўсіх гэтых людзей зоркі нямыя. А ў цябе будуць зусім асаблівыя зоркі … Ты зірнеш уначы на неба, а там будзе такая зорка, дзе я жыву, дзе я смяюся, і ты пачуеш, што ўсе зоркі смяюцца. У цябе будуць зоркі, якія ўмеюць смяяцца".

Так заканчваецца гэта духмяная, крыху сумная лірычная казка, казка пра вялікую любоў да людзей, пра веру і мужнасць.

Асоба праяўляе пэўныя адносіны да свету, асяродку жыццядзейнасці, вучыцца ацэньваць сябе збоку, з пазіцыі іншага. Дзякуючы гэтаму, асоба і падуладна ўздзеянню мастацкага твора: ён выступае своеасаблівым люстэркам, у якім чытач мае магчымасць убачыць і ацаніць сябе, выказаць свае адносіны да вобраза і той рэчаіснасці, якая адлюстравана ў ім. З гэтага вынікае адна з цэнтральных установак выхавання асобы ў працэсе чытання – яго накіраванасць на фарміраванне здольнасці меркаваць, мець свой погляд, свае адносіны да чытаемага твора і здольнасці пераносіць гэтыя адносіны на самога сябе. Але чытанне прадуктыўнае толькі тады, калі яно арыентаванае на засваенне літаратуры на ўзроўні асобаснага сэнсу, што не сумяшчальна з разуменнем чытання як дзеяння, мэта якога толькі пашырэнне ведаў, узбагачэнне чытача рознай інфармацыяй. Сама прырода асобы і працэс яе станаўлення абумоўліваюць адзінства пазнавальнай і выхаваўчай накіраванасці чытання. Пазнанне губляе выхаваўчую сілу, калі не мае асобаснага сэнсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ